*Н. В. Матыліцкая*

# ВЫЯЎЛЕННЕ МІФІЧНАГА ЧАСУ І ПРАСТОРЫ Ў ВАЛАЧОБНЫХ ПЕСНЯХ СЛУЧЧЫНЫ

Прастора і час – усеагульныя формы быцця матэрыі, яе важнейшыя складнікі. Гэта філасофскія катэгорыі, з дапамогай якіх адлюстроўваюцца «формы быцця рэчаў і з'яў, выяўляючы, з аднаго боку, іх са-быццё ("со-бытие"), суіснаванне (у П.), з другога – працэсы змены іх адзін адным (у Ч.), працягласць іх існавання» [5, с.804]. Паводле поглядаў Ньютана, прастора і час прадстаўляліся як аднародныя і абсалютныя формы быцця. Прастора мела характарыстыку «пустой», а час – аўтаномнай ад чалавека субстанцыі. Пазней гэта было пераасэнсавана філасофіяй Дэкарта і фізікай XX ст. У Дэкарта прастора «запоўненая», фізіка ж увогуле высунула ідэю аб адзінстве прасторы і часу, якое фарміруе шматмерныя параметры быцця [5, с.804].

Гэта філасофскае азначэнне катэгорый прасторы і часу, але яно якасна адрозніваецца ад разумення гэтых катэгорый у архаічных культурах. У літаратуры па даследаванні тэорыі міфа гэтыя катэгорыі атрымалі назву «міфічны час» і «міфічная прастора». Катэгорыя *міфічнага часу* даволі добра асветлена ў рабоце сусветнавядомага даследчыка міфалогіі Мірча Эліадэ «Аспекты міфа». У розным успрыманні часу хаваецца розніца паміж старажытным і сучасным чалавекам. М. Эліадэ адзначае, што чалавек архаічнага грамадства адчувае сябе непарыўна звязаным з касмічнымі рытмамі, у той час як сучасны – з гісторыяй. Касмічныя рытмы цыклічныя і зваротныя (сакральны час), а гісторыя – лінейная і незваротная (прафанны час). Час міфічны – гэта час першатварэння. Аналізуючы гэты час у розных народаў, Эліадэ дае нейкую агульную характарыстыку «першапачатковай райскай эпохі». Аднак сувязь з небам не страчана канчаткова, пры дапамозе спецыяльных сродкаў у пэўныя моманты магчыма вяртанне да часу першапачатковасці. Гэта дасягалася найперш пры дапамозе рытуалу. Эліадэ вылучае асабліва абрады ініцыяцыі і святкавання Новага года. Ён робіць выснову: «Перажываць занава гэты час, узнаўляць яго як можна часцей, занава прысутнічаць на спектаклі боскіх тварэнняў, зноў бачыць звышнатуральных істот і ўспрыняць

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

іх урок творчасці – такое жаданне назіраецца ва ўсіх рытуальных узнаўленнях міфаў» [9, с.24–25].

*Міфічную прастору* даследаваў вядомы расійскі даследчык міфалогіі Уладзімір Тапароў, які пісаў пра яе «адухоўленасць і якасную разнароднасць». У супрацьлегласць Ньютанаву разуменню яна «не з’яўляецца ідэальнай, абстрактнай, пустой» [8, с.340]. Даследчык таксама ўказвае, што для міфапаэтычнай свядомасці не было падзелу прасторы і часу і таму яны ўтвараюць адзінства (тое ж, што, нарэшце, прызнала фізіка ў ХХ ст.), якое атрымала назву «хранатоп».

Даследчыкі фальклору адрозніваюць два паняцці – час міфічны і *час фальклорны* [3, с.45, 46]. А ў дачыненні да непасрэдна каляндарна-абрадавага фальклору ўжываецца тэрмін «каляндарны час». Каляндарны час, пра міфапаэтычную семантыку якога мы гаворым, уваходзіць таксама ў сістэму народнай аксіялогіі: побач з элементамі традыцыйнай карціны свету (перш за ўсё прасторай) час атрымлівае якасныя характарыстыкі і ўспрымаецца як неаднародны. Дарэчы, неаднароднасць і «якаснасць» часу і прасторы – адна з важнейшых прыкмет міфалагічнага мыслення [1, с.22].

У параўнанні з астатнімі жанрамі фальклору ў каляндарна-абрадавым фальклоры час і прастора найбольш захавалі архаічныя рысы.

Ідэя паяднання часу і прасторы як першасных, сакральных, ідэальных выяўляецца ў некаторых беларускіх валачобных песнях. Мы разгледзім адну з сюжэтных сітуацый, якая мае найбольш поўны варыянт на Случчыне. У тэксце напачатку падаецца разгорнуты ідэальны абразок гаспадарскага двара з залатой гарой пасярэдзіне, садам і райскімі птушкамі. Далей «шура-бура» знішчае гэту ідылію дабрабыту, а засмучанага гаспадара суцяшае мудрымі словамі яго гаспадыня. Інварыянтная схема матываў у песнях, дзе гаворыцца аб пашкоджанні двара, наступная: 1) *валачобнікі ў дарозе* + 2) *упарадкаваны гаспадарскі двор* + 3) *пашкоджанне двара* + 4) *журба гаспадара* + 5) *суцяшэнне гаспадара гаспадыняю* + 6) *просьба валачобнікамі дароў* .

Генетычна дадзеныя матывы звязаны з міфалагічнымі ўяўленнямі пра неабходнасць рытуальнага адраджэння свету напачатку кожнага прыроднага цыкла. Валачобныя і калядныя абрады – гэта, безумоўна, абрады Пачатку. Не выклікае сумнення,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

што ў кантэксце сусветнай міфалогіі трыяда стварэнне свету – яго занепад напрыканцы года – абавязковае рытуальнае аднаўленне адносіцца да ліку ўніверсальных [6, с.106–113]. Як піша М. Эліадэ, «для архаічных грамадстваў жыццё не можа быць выпраўлена, яно можа быць толькі створана занава праз вяртанне да сваіх вытокаў. А сапраўдны выток мысліцца як вызваленне неверагоднай энергіі, жыцця і плоднасці, якім суправаджалася стварэнне свету» [9, с.56]. У дадзенай сюжэтнай сітуацыі канцэпты часу і прасторы паказаны ва ўзаемасувязі: ідэя часу першатварэння – сакральнага часу, якім ёсць велікодны час як час пачатку года, разгортваецца ў міфічнай прасторы ідэальна апісанага гаспадарскага двара, які створаны па мадэлі бачання сялянамі раю. Рэпрэзентам міфічнай прасторы выступае «райскі сад». Сад месціцца на гаспадарскім двары, можна сказаць, супадае з ім. Дэталі ідэальна ўпарадкаванага двара (гара, птушкі, сталы, кубкі, расліны), якія абазначаюць асобныя аб’екты гэтай прасторы, толькі падкрэсліваюць і ўдакладняюць статус прасторы, яе міфічнасць. Гэта выяўляецца пры семантычным аналізе згаданых аб’ектаў.

Універсальныя міфалагічныя канцэпты Цэнтра свету – гара і дрэва. Першы актуалізуецца ў валачобных песнях праз вобраз «залатой гары» ў цэнтры гаспадарскага двара. Універсальны міфалагічны канцэпт Сусветнага дрэва ў дадзеным сюжэце рэалізуецца праз раслінны код – *«ягор», сад-вінаград (сады-прысады)*. Як бачым, канцэпт «райскага саду» звязваўся ў беларусаў з вінаградам. Сімволіка вінаграду ў дадзеным кантэксце – «здароўе, плоднасць, багацце, хараство – уся “салодкасць” маладога жыцця» [2, с.84], бо з раем звязвалася паняцце «вечнай маладосці». Вобраз птушак канкрэтызуецца праз азначэнні *райскія і «морскія»*. Эпітэт *морскія* ўказвае на ўяўленні пра месцазнаходжанне раю – за морам / пасярод мора.

Заключны матыў твора ўтрымлівае ідэю *цыклічнасці* часу – асноўнай характарыстыкі міфічнага часу. Цыкл (у дадзеным выпадку канец года) мог завяршыцца разбурэннем свету, што ўвасабляецца ў валачобнай песні праз матыў разбурэння гаспадарскага двара «шурай-бурай». Гэта адвечная міфалагічная ідэя барацьбы Хаоса з Космасам. У адным са сваіх артыкулаў мы сцвярджаем, што міфалагема «шура-бура» і ёсць адлюстраванне ідэі Хаосу ў беларускім фальклоры [7, с.84–86].

Разбурэнне напрыканцы цыкла не мыслілася як канчатковае, бо згодна з міфалагічнай логікай павінен пасля завяршэння старога

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цыкла прыйсці новы цыкл. Так, матыў «суцяшэння гаспадара гаспадыняю» ўтрымлівае, на нашу думку, міфалагічную ідэю *аднаўлення прасторы:* разбураны свет = пашкоджаны двор можа быць адноўлены па першапачатковым узоры. Галоўная роля ў ініцыятыве па аднаўленні двара (прасторы) адводзіцца жанчыне, якая суцяшае мужа мудрымі словамі:

*Да калі будзем жыці да быці,*
*Мы тую гару зноў панасыпляем,*
*Тыны-прытыны папрытынваем,*
*Сады-прысады панасаджваем,*
*Райскія пташкі папрынаджваем* [4, с.103]*.

Агульнавядома значэнне абрадавых слоў. Касмаганічныя міфы пра пачатак і пра стварэнне свету прамаўляліся жрацамі над цяжкахворым чалавекам. Верылі, што энергія слоў пра нараджэнне свету дапаможа хвораму «нарадзіцца зноў», гэта значыць аднавіць свае сілы.

Такім чынам, мы разгледзелі, як паняцце міфічнага часу і прасторы выявілася ў валачобных песнях. Найбольш поўны варыянт сюжэтнай сітуацыі, якая захавалася менавіта на Случчыне, дазваляе ўбачыць асноўныя рысы міфічных часу і прасторы: цыклічнасць часу, якасную разнароднасць прасторы, а таксама ідэю паяднання гэтых канцэптаў, так званы хранатоп. У творы знаходзім уяўленне пра цэнтр свету ў міфапаэтычнай мадэлі свету, якое прадстаўлена праз канкрэтныя вобразы. Ідэя разбурэння ідэальнай прасторы напрыканцы года і будучага яе аднаўлення па першаўзоры захавала архаічную ідэю барацьбы Хаосу і Космасу.

1. *Агапкина, Т. А.* Мифопоэтические основы славянского народного календаря. Весенне-летний цикл / Т. А. Агапкина. – М.: Индрик, 2002. – 816 с. – (Традиционная духовная культура славян. Современные исследования).

2. *Беларуская* міфалогія: энцыкл. слоўнік / С. Санько [і інш.]. – Мінск: Беларусь, 2004. – 592 с.

3. *Восточнославянский* фольклор: словарь науч. и нар. терминологии / редкол.: К. П. Кабашников (отв. ред.) [и др.]. – Минск: Наука и техника, 1993. – 478 с.

4. *Гілевіч, Н. С.* Песні народных свят і абрадаў / уклад. і рэд. Н. С. Гілевіча. – Мінск: Выд-ва БДУ, 1974. – 464 с.

* Песня зафіксавана ў в. Астрэйкі Капыльскага раёна Мінскай вобласці (зона Случчыны).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Грицанов, А. А.* Пространство и время / А. А. Грицанов // Новейший философский словарь: 3-е изд., испр. / сост. и гл. науч. ред. А. А. Грицанов. – Минск, 2003. – С. 804.

6. *Матыліцкая (Скобла), Н.* Трыяда упарадкаванасць / пашкоджанне / аднаўленне гаспадарчага двара ў валачобных песнях Случчыны / Н. В. Матыліцкая // Фалькларыстычныя даследаванні. Кантэкст. Тыпалогія. Сувязі: зб. артыкулаў / пад навук. рэд. Р. М. Кавалёвай і В. В. Прыемка. – Мінск, 2005. – Вып. 2. – С.106–113.

7. *Матыліцкая, Н. В.* Міфалагема *шурум-бурум* як адлюстраванне вобраза хаосу: на матэрыяле каляндарна-абрадавага фальклору Случчыны / Н. В. Матыліцкая // Весці БДПУ. Сер.1, Педагогіка. Псіхалогія. Філалогія. – 2006. – № 4. – С. 84–86.

8. *Топоров, В. Н.* Пространство / В. Н. Топоров // Мифы народов мира: энцикл.: в 2 т. / гл. ред. С. А. Токарев. – М.: Сов. энцикл., 1991–1992. – Т.2: К–Я.

9. *Элиаде, М.* Аспекты мифа / М. Элиаде. – М.: Акад. проект, 2000. – 222 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ